# Круглы стол “Адысея Язэпа Пушчы” ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі

*2022-05-23*

20 мая 2022 года ўдзельнікі **СНДЛ “Літаратура: погляд маладых”** наведалі круглы стол **“Адысея Язэпа Пушчы: да 120-годдзя з дня нараджэння”**, які праводзіўся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Удзельнікі студэнцкай лабараторыі **Ганна Грыга**, **Алена Сівіцкая** і **Карына Шыдук**, у сферы навуковых інтарэсаў якіх знаходзіцца літаратура 1920–1930-х гадоў, змаглі паслухаць паведамленні, прысвечаныя юбіляру.

На груглым стале выступілі аўтарытэтныя даследчыкі **Ірына Багдановіч**, **Віктар Жыбуль**, навуковы кіраўнік СНДЛ “Літаратура: погляд маладых” **Наталля Заяц**, вядучы бібліятэкар **Дзмітрый Давідоўскі**, загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча **Міхаіл Бараноўскі**…

Галоўны бібліёграф **Юлія Амосава** прэзентавала раздзел “Язэп Пушча (Іосіф Паўлавіч Плашчынскі)” віртуальнага праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця”. Раздзел папоўніў каштоўную віртуальную калекцыю Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У ім сабраны эксклюзіўныя фотаздымкі, аўтографы, адлічбаваныя кнігі паэта, рукапісы вершаў, запісныя кніжкі, матэрыялы пра яго творчасці многае іншае.

З прывітальным словам да ўдзельнікаў звярнуўся намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Віктар Пшыбытка**.Кіравала мерапрыемствам загадчык сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве інфармацыйна-аналітычнага аддзела **Таццяна Лаўрык**.

У самым пачатку круглага стала прагучалі вершы юбіляра ў выкананні артыстаў народнага літаратурнага тэатра **“Жывое слова”** (мастацкі кіраўнік **Алеся Сівохіна**).

Падрабязней пра праект тут





